■ На слыху

# Знішчыць нельга кансерваваць

**Праект дэталёвага планавання забудовы ў межах сталічных вуліц Старавіленская—Кісялёва—Куйбышава—Камуністычная, які прадугледжваў знос Асмалоўкі, не прыняты да зацвярджэння. Рашэнне прыняў архітэктурна-горадабудаўнічы савет пры галоўным архітэктару Мінска.**

Праект плана забудовы прадугледжваў ажыццяўленне работ у два этапы. На першым — да 2020 года — пабудаваць жылы дом у раёне вуліцы Старавіленскай, а на другім — пасля 2020-га — знесці пасляваенныя двухпавярховыя дамы, якія сёння з'яўляюцца візітоўкай Асмалоўкі, і пабудаваць на іх месцы новыя жылыя комплексы з гандлёва-адміністрацыйнымі аб'ектамі. Праект выклікаў гучны грамадскі рэзананс, яго абмеркаванне з удзелам жыхароў Асмалоўкі, грамадскіх актывістаў, гісторыкаў і проста нераўнадушных грамадзян на розных узроўнях доўжылася амаль месяц. У ходзе абмеркавання ўладам паступіла больш як 60 зваротаў, у тым ліку калектыўных, а свае подпісы пад петыцыяй супраць зносу двухпавярховікаў пакінулі больш як 7 тысяч чалавек (пры гэтым насельніцтва самой Асмалоўкі, па падліках спецыялістаў, каля 2 тысяч).

— Мы ўважліва сачылі за правядзеннем грамадскага абмеркавання, і для нас вельмі важным было меркаванне грамадскасці, — цытуе БЕЛТА **галоўнага архітэктара Мінска Паўла ЛУЧЫНОВІЧА.** — Думаем, што дачасна рэалізоўваць праектныя рашэнні дэталёвага плана.

Так, па словах галоўнага архітэктара, у план забудовы будуць унесеныя змены. Паводле рашэння архітэктурна-горадабудаўнічага савета плануецца разгледзець дадатковыя матэрыялы, правесці аналіз фізічнага стану жылых будынкаў. Таксама члены савета падтрымалі ідэю аб правядзенні адкрытага міжнароднага конкурсу на эскіз рэканструкцыі гэтай важнай тэрыторыі. Прапанова пераможцы і ляжа ў аснову будучага дэталёвага плана. Таксама застаецца актуальнай тэма вызначэння ахоўных зон гісторыка-культурных каштоўнасцяў.

— Натуральна, Асмалоўка будзе развівацца. І зараз важна наладзіць дыялог паміж уладай, архітэктурнай грамадскасцю і жыхарамі Асмалоўкі, вызначыць, якім будзе раён. Гэта важная частка сталіцы, дзе ёсць свая аўра, атмасфера, але яна знаходзіцца ў ядры горада і патрабуе пераасэнсавання, — лічыць Павел Лучыновіч.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

■

# Клімат у нас такі?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Увогуле, гэты месяц прыкладна ў 40 працэнтах выпадкаў становіцца самым цёплым падчас лета — не выключана, што так будзе і сёлета. Пры гэтым, як сцвярджае спецыяліст, тэмпература паветра ў ліпені таксама знаходзіцца ў межах нормы, і ўспрымаецца жыхарамі як халодная, хутчэй, на фоне спёкі ў папярэднія гады.



Пра стан паветра ў гарадах краіны расказала **начальнік інфармацыйна-аналітычнага аддзела маніторынгу атмасфернага паветра Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Багдана КАЗЯРУК.** Паводле яе слоў, ветранае і дажджлівае надвор'е сёлета аказала пазітыўны ўплыў на яго якасць. Пры гэтым, нярэдкімі застаюцца выпадкі часовага росту забруджанасці паветра, асабліва ў гарадах, дзе размяшчаецца буйная вытворчасць. Так, напрыклад, для Наваполацка «праблемным» з'яўляецца заходні вецер, бо менавіта на захадзе горада знаходзяцца нафтаперапрацоўчыя прадпрыемствы. У Гомелі ў заходняй частцы горада (вуліца Барыкіна) нярэдка перавышаюцца нормы па ўтрыманні ў паветры аксіду вугляроду, у Магілёве — самая высокая паўтаральнасць перавышэнняў нарматываў якасці па фенолах, у Наваполацку эпізадычна фіксуюцца перавышэнні па дыяксідзе серы. У Мінску сітуацыя стабілізавалася, але часам у паветры ўтрымліваецца зашмат пылу. У перыяды без ападкаў яго канцэнтрацыя павышаецца. Але характарызуючы першае паўгоддзе, спецыяліст адзначыла, што ў большасці гарадоў, дзе праводзіцца маніторынг атмасфернага паветра, яго якасць ацэньваецца як стабільна добрая.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

# ЯК УСЕ ДЗЕЦІ

## Стартавалі штогадовыя рэабілітацыйна-аздараўленчыя праекты Беларускага дзіцячага фонду для цяжкахворых дзяцей

**Дзеці, якія перанеслі аперацыі на сэрцы, адпачываюць і праходзяць рэабілітацыю ў аздараўленчым цэнтры «Надзея», з анкалагічнымі захворваннямі — у «Зубраняці».**

Такая магчымасць дазваляе вырвацца са звычайных медыцынскіх устаноў. Спецыяльны рэабілітацыйны курс для праектаў «Вясёлыя сэрцайкі» і «Вясёлка надзеі» распрацаваны Дзіцячым фондам сумесна з псіхолагамі, урачамі-кардыёлагамі і анколагамі з улікам узросту і стану здароўя кожнага. Спартыўная праграма прадугледжвае пешыя і велапрагулкі, заняткі футболам, настольным тэнісам, валейболам. Ёсць сеансы спелеа-, фіта- і араматэрапіі, дыхальнай гімнастыкі. Псіхолаг прапануе праграму практычных заняткаў для развіцця камунікатыўных навыкаў.

Удзельнікамі змен становяцца дзеці нават з вельмі складаным станам здароўя — якія перанеслі некалькі аперацый, або якім паставілі кардыястымулятар, або пастаўленыя ў ліст чакання на перасадку сэрца. Іх бацькі звяртаюцца ў абласныя аддзяленні Дзіцячага фонду або цэнтральны офіс у Мінску і просяць уключыць іх дзіця ў праект. «Вясёлка надзеі» для анкахворых праводзіцца з 1992 года, і з таго часу аздараўленне прайшлі больш за 2,5 тысячы чалавек. Удзельнікамі «Вясёлых сэрцайкаў», якія праводзяцца з 2006 года, сталі больш за 500 дзяцей.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

■ Далучайцеся

# ЗБЯРОМ РАЗАМ РАНЕЦ ДЛЯ БУДУЧАГА ШКОЛЬНІКА!

**У сталіцы праходзіць традыцыйная дабрачынная акцыя «Партфель першакласніка».**

Акцыя арганізавана ў пяці буйных універмагах Мінска: ГУМе, ЦУМе, гандлёвым доме «На Нямізе», універмагу «Беларусь» і гандлёвым цэнтры «Кірмаш». Галоўная яе мэта — дапамагчы малазабяспечаным і шматдзетным сем'ям, бацькам, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, а таксама сем'ям, у якіх адзін або абодва бацькі з'яўляюцца інвалідамі І-й ці ІІ-й групы, падрыхтаваць першакласнікаў да школы.

Прыняць удзел у згаданым дабрачынным мерапрыемстве можа любы ахвотны. Для гэтага дастаткова купіць школьныя прыналежнасці для першакласнікаў у адным з універмагаў, пералічаных вышэй, і пакінуць іх у спецыяльным валанцёрскім пункце проста ў краме. Па буднях з 13.00 да 19.00, а па выхадных — з 12.00 да 16.00 там будуць дзяжурыць валанцёры БРСМ і прадстаўнікі тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Калі вы не ведаеце, якія тавары неабходны будучым першакласнікам, валанцёры вам падкажуць.

Акрамя таго, можна пералічыць грошы на разліковы рахунак Мінскай гарадской арганізацыі «Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў» з паметкай «Партфель першакласніка». Банкаўскія рэквізіты: BY51 AKBB 3015 0000 0030 7000 0000 BYN БІК: AKBBBY2X.

Акцыя будзе доўжыцца да 20 жніўня. А 22 жніўня партфелі са школьнымі прыладамі, сабраныя неабыякавымі мінчанамі, урачыста ўручаць будучым першакласнікам ў кінатэатры «Піянер».

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

■

# Зноў цёпла і з дажджамі

**На гэтым тыдні ў Беларусі чакаецца цёплае і дажджлівае надвор'е, паведамляюць у Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. Тэмпература застанецца характэрнай для гэтага часу, але атмасферныя франты, што рухаюцца з паўднёвага захаду Еўропы, прынясуць не толькі цёплае паветра, але і дажджы, якія нярэдка будуць суправаджацца навальніцамі і моцным ветрам.**

Сёння, у аўторак, ноччу ў асобных раёнах, а ўдзень на пераважнай частцы тэрыторыі краіны, пройдуць кароткачасовыя дажджы. Днём па поўдні краіны магчымы навальніцы, у асобных раёнах — моцныя залевы. Такое надвор'е будзе суправаджацца моцным ветрам, магчымы град. Ноччу і ранкам месцамі прагназуецца туман. У цёмны час сутак чакаецца 12—18 градусаў цяпла, удзень — 22—28, а на паўднёвым усходзе слупок тэрмометра можа падняцца і да 30.

У сераду захаваецца няўстойлівае надвор'е, па большай частцы Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах — навальніцы, моцныя дажджы, магчымы град. Ноччу будзе ад 15 да 20 цяпла, днём — ад 21 градуса па захадзе да 31 — на ўсходзе.

У чацвер з ростам атмасфернага ціску надвор'е ненадоўга палепшыцца, але ў асобных раёнах краіны зноў не абыдзецца без кароткачасовых дажджоў і навальніц. Тэмпература паветра ноччу складзе 12—19 градусаў, днём — 22—28. На паўднёвым усходзе Гомельскай вобласці слупок тэрмометра можа дасягнуць адзнакі «+30».

У пятніцу ноччу пераважна па поўдні, а ўдзень па большай частцы тэрыторыі чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Днём у асобных раёнах чакаюцца навальніцы, моцныя дажджы, магчымы град. Ноччу будзе 13—20 градусаў вышэй за нуль, днём — 20—27, а на ўсходзе ў асобных раёнах будзе да плюс 30.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

**Извещение о проведении открытых аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков**

**Организатор:** Государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42-61-62.

| Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды, размер начальной цены и задатка |
|---|
| **Лот №1.** Право заключения договора аренды на 5 лет земельного участка, кадастровый №220850100001002302, площадь 0,0045 га, адрес: Витебская обл., Браславский р-н, г. Браслав, ул. Октября, для размещения объектов розничной торговли (для строительства торгового павильона). **Нач. цена**: 253,53 руб. **Задаток:** 25,36 руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 28.08.2017 в 14.00 по адресу: г. Браслав, ул. Советская, 119 в Браславском райисполкоме. **Срок внесения задатков и приема документов:** с 25.07.2017 с 8.30 по 25.08.2017 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Реквизиты для внесения задатка** р/с BY60AKBB36003120000060000000 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04002, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Браславский райисполком). **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** заключить договор аренды зем. участка с Браславским райисполкомом не позднее двух рабочих дней после внесения денежных средств и выполнения условий, указанных в протоколе о результатах аукциона; после получения свидетельства о государственной регистрации в срок, не превышающий трех месяцев, получить разрешение на проведение проектно-изыскательных работ, архитектурно-планировочное задание в отделе архитектуры и строительства Браславского райисполкома и технические условия на инженерно-техническое обеспечение объекта строительства; разработать и утвердить в установленном порядке проектно-сметную документацию на строительство объекта в срок, не превышающий 2 (два) года; приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее шести месяцев с момента утверждения в установленном порядке проектно-сметной документации на строительство объекта и получения разрешения на производство строительно-монтажных работ; по окончании срока аренды земельного участка совместно с райисполкомом в установленном порядке решить вопрос его дальнейшего использования. |

| Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды, размер начальной цены и задатка. |
|---|
| **Лот №1.** Право заключения договора аренды на 3 года земельного участка, кадастровый №240100000001007265, площадь 0,0013 га, адрес: Витебская обл., г. Витебск, ул. Правды, у дома №39/1, для установки торгового киоска (размещение объектов розничной торговли), без создания капитального строения. **Нач. цена**: 156,54 руб. **Задаток:** 15,65 руб. |
| **Лот №2.** Право заключения договора аренды на 3 года земельного участка, кадастровый №240100000003001563, площадь 0,0016 га, адрес: Витебская обл., г. Витебск, Московский проспект, у дома №45, корп.1 под павильон с торговым залом (размещение объектов розничной торговли), без создания капитального строения. **Нач. цена**: 190,90 руб. **Задаток:** 19,09 руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 25.08.2017 в 16.00. по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 25.07.2017 с 8.30 по 24.08.2017 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY14AKBB36423020002802000000 в ф-ле №200 Витебское обл. управление ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21200, УНП 300200386, получатель платежа: Витебский горисполком. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** заключить договор аренды зем. участка с Витебским горисполкомом; согласовать в отделе архитектуры и градостроительства Витебского городского исполнительного комитета эскиз торгового киоска с точными местами привязки объекта, указанием габаритных размеров.. |

Аукционы проводятся в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. Для участия в аукционе приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели, юр. лица, консолидированные участники (двое и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юр. лиц). Граждане, индивидуальные предприниматели, консолидированные участники и юр. лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок подают заявление на участие в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, с отметкой банка, заключают соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином — копия документа, содержащего его идентификационные сведения; индивидуальным предпринимателем — копия свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя — нотариально удостоверенная доверенность; представителем юр. лица РБ — доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем иностранного юр. лица — легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык, легализованные доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина — легализованная доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; консолидированными участниками представляются оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за предмет аукциона и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка, но не позднее трех месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в установленном порядке обратиться за государственной регистрацией возникновения прав на земельный участок в РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру». Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка.

**Конт. тел.: (0212)42-61-62, (029)510-07-63,**
**e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**